## ПАДПОЛЬНЫЯ ГРУПЫ
## Ф. К. МЕХАВА і А. А. ГАГУЛІ

**Перыяд дзеяння:**

жнівень 1941 г. – лістапад 1943 г.

**Месца дзеяння:**

чыгунка, раён Вапнавых і Гарадоцкіх вуліц г. Віцебска

**Колькасць:**

24 чалавекі

**Кіраўнікі:**

Мехаў Фёдар Калістратавіч, Гагуля Андрэй

Дзейнічалі са жніўня 1941 г. да лютага 1943 г. на чыгунцы ў Віцебску. Аб’ядноўвалі 24 чалавекі, пераважна моладзь, вучняў 20-й і 25-й сярэдніх школ горада. Кіраўнікі – Ф. К. Мехаў і А. А. Гагуля. Спачатку групы працавалі пад кіраўніцтвам Мехава, а з кастрычніка 1942 г. – самастойна, але ў цесным кантакце.

Да канца 1941 г. склад групы Мехава быў наступным: У. Ю. Баталкін, В. К. Багданава (Аляксандрава), В. А. Гагуля, І. М. Ерафееў («Цыганок»), А. М. Івашчанка, І. М. і А. М. Іоткі, У. М. Кузнечык, Д. Ф. Тарасаў, С. М. Шалаеў, Ф. М. Шалаева (Несцярэнка), В. А. Шніпаў, К. І. Шутаў, сем’і Лапавухавых, Мехавых і Шутавых. Канспіратыўнымі былі кватэры Шалаевай (вуліца 14-я Гарадоцкая, 19) і Шніпава (вуліца 22-я Гарадоцкая, 7).

У маі 1942 г. Мехаў, Шутаў і Гагуля звязаліся з аператыўна-чэкісцкай групай А. П. Максіменкі, а праз яе – з Віцебскім падпольным гаркамам КП(б)Б. Абедзве групы займаліся разведкай і дыверсіямі на чыгуначным вузле. Падлеткі Ерафееў і Тарасаў назіралі за рухам цягнікоў, разгрузкай і пагрузкай, запаміналі надпісы на вагонах, аўтамашынах і цегачах. Гагуля і У. Ф. Няглін здабывалі дакументы для групы Максіменкі. Знаёмства з паліцаямі дапамагло Івашчанку ўвосень 1942 г. прадухіліць правал у групе. Шутаў і Мехаў працавалі ў аўтарамонтных майстэрнях, разам з ваеннапалоннымі неаднаразова псавалі рухавікі аўтамашын і танкаў, вывелі да партызан 6 ваеннапалонных. Летам 1942 г. Мехаў, Гагуля, Шутаў і І. М. Іотка замініравалі чыгунку каля в. Грышаны,

пусцілі пад адхон паравоз і некалькі вагонаў з боепрыпасамі. У канцы верасня падпольшчыкі магнітнымі мінамі ўзарвалі эшалон з жывой сілай і баявой тэхнікай праціўніка. За верасень – кастрычнік 1942 г. вывелі са строю 20 аўтамашын, 23 веласіпеды, 2 лентачныя транспарцёры, выкралі 300 камплектаў абмундзіравання, 40 коўдраў, 600 кг сметанкавага масла, 500 кг цукру, 250 л гарэлкі, 10 тон хлеба, 10 скрынак мыла.

У пачатку снежня 1942 г. былі арыштаваны А. А. Гагуля, В. А. Гагуля, П. В. Гурын, І. М. Ерафееў, У. М. Кузнечык, А. Н. Лапавухаў, К. Я. Лапавухава, С. М. Шалаеў, В. А. Шніпаў. Тры тыдні здзекаваліся з патрыётаў. Раніцай 23 снежня 1942 г. у двор гарадской турмы па вуліцы Суражскай прыбылі дзве грузавыя аўтамашыны. Падпольшчыкаў вызывалі па аднаму, завязвалі рукі і саджалі ў машыны. 26 патрыётаў пад канвоем павезлі да былога 5-га Чыгуначнага палка. Па дарозе сябры развіталіся, дзяўчыны запелі песню «Последний нынешний денечек…».

…Машыны спыніліся каля пабудовы, размешчанай на тэрыторыі, якая прылягала да лагера ваеннапалонных. У некалькіх метрах ад яе былі выкапаны дзве ямы… Усе, апрача Ерафеева, якому пашчасціла ўцячы, былі хутка расстраляны. Тыя, што засталіся на волі, працягвалі барацьбу. 9 снежня ўзарвалі чыгуначны мост цераз вуліцу Яноўскую (зараз вуліца Мічурына), 21 снежня – воінскі эшалон з аўтамашынамі і харчаваннем, што знаходзіўся за 4 км ад горада. У дзень пакарання таварышаў патрыёты адправілі пад адхон эшалон праціўніка, у студзені 1943 г. – яшчэ два.

У час карнай экспедыцыі нямецка-фашысцкіх акупантаў у лютым 1943 г. загінулі І. М. Іотка, А. А. Іваноў, у маі – Ф. К. Мехаў.

Ф. К. Мехаў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, А. А. Гагуля – медалём «За адвагу».

## ЛІТАРАТУРА


1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Мехава Ф. К. і Гагулі А. А. / Н. І. Дарафеенка, М. У. Дарафеенка // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945 : энцыклапедыя / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1990. – С. 131–132.

2. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Ф. К. Мехава і А. А. Гагулі / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 493–494.

3. **Красновская, Н.** Мы – наследники Победы / Н. Красновская // Мир вокруг нас (Витебск). – 2010. – № 15. – С. 12–13.

4. **Подпольная** группа Мехова Ф. К. и Гогули А. А. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 298.